5 05

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся.

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА



Тав. Гольдштэйн была сьлесарам, а зараз працуе пам. машыніста МБВ чыгункі.

№ 6

Сакавік 1929 г.

Выражце гэты білет, напішэце на ім сваё прозьвішча, імя, адрас і тэрмін падпіскі і РАЗАМ З КВІТКОМ НА ЗДАЧУ ПАДПІСКІ перашліце ў рэдакцыю часопісі

„БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“

Менск, Савецкая 45.

Лётарэйныя білеты будуць друкавацца ў нашай часопісі пачынаючы з сакавіка месяца, але права на ўдзел у лётарэі маюць толькі тыя, хто падпісаўся на „БЕЛРАБСЯЛЯНКУ“ ў час з 1-га студзеня да 1-га мая, ня менш як на 3 месяцы.

3-х месячныя падпішчыкі перасылаюць у рэдакцыю (разам з квітком на здачу падпіскі) . . 1 білет.
Паўгадовыя . . . . . 2 білеты.
Падпішчыкі на 9 месяцаў . . . 3 білеты.
Падпішчыкі на год . . . . . 4 білеты.

Каляктыўныя падпішчыкі прысылаюць адразу ўсе білеты з агульным квітком на здачу падпіскі.

Перасылка лётарэйных білетаў павінна быць аплачана маркамі, даплатныя—выкупацца ня будуць.

Лётарэйны білет №

НА ПРАВА ЎДЗЕЛУ Ў ВЯЛІКАЙ ЛЁТАРЭІ ЧАСОПІСІ „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“.

Прозьвішча і імя.....

Паштовае аддзяленьне.....

Акруга.....

Раён.....

Вёска.....

Тэрмін падпіскі.....

Зараз праходзіць падрыхтоўка да чысткі савецкага апарату ад чужых нам, прымазаўшыхся людзей.

Працоўныя жанчыны! Дапамажыце савецкай уладзе вызваліцца ад такіх элемэнтаў. Сьмела выкрывайце ўсіх бюракратаў і шкоднікаў.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Гехт, Серман, Голуб, Дрынёва, Адзінец, Марголіна—атрымаюць адказы праз пошту.

Вершы Качан С., Мухін, Масюкевіч, Дрэвоцінай, Зянкевіч, Грыневіч, Пчалкоў, Кандратовіч, Дубсон, Брэская, Ядловец, Ривкин, Прахорчык, Кармазінавай — друкаваць ня будзем, напісаны слаба.

Сімановіч Фане. Ваша карэспандэнцыя друкавацца ня будзе.

Гальперынай. Допіс друкаваць ня будзем. Пішыце, як жанчыны ўдзельнічаюць у культурна-бытавым паходзе.

Кіндзерскай. Пішыце, як спраўляюцца з практычнай працай жанчыны, якія скончылі кааператыўныя курсы.

Школьнікавай. Зьнімак—„Ліквідацыя няпісьменнасьці“—будзе зьмешчаны. Другі зьнімак зьмяшчаць ня будзем.

Маркавай. Вы, таварыш, пішаце аб тым, што трэба арганізоўвацца ў калгасы. Трэба пісаць аб жыцьці калгасаў, якія маюцца ў вашым раёне, давайце мясцовыя прыклады аб дадатных і адмоўных бакох каляктываў.

Шапіро Б. Вашу прапанову аб экскурсіі сялянак у сумежны калгас унясіце на дэлегацкім сходзе. Мы згодны з вамі ў тым, што такая экскурсія—цікавая і карысная справа.

Прахорчык М. Карэспандэнцыя, у якой вы заклікаеце перачышчаць насеньне, зьмешчана ня будзе. Аб падрыхтоўцы да веснавое сяўбы ў кожнай вёсцы маецца многа мясцовых фактаў, якія больш за ўсё трэба асьвятляць.

Рудзінай. Аб 10-годзьдзі БССР і перавыбарах саветаў—матар'ял спазьніўся. Пішыце, як праходзіць культурна-бытавы паход.

Ратчанскі. Допіс друкаваць ня будзем. Пішыце аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і як удзельнічаюць у гэтай справе сялянкі.

Хаміцкай І. Допіс друкаваць ня будзем. Пішыце аб тым, як жанчыны праявілі сябе ў двухтыднёвік ашчадных кас.

Т. Жураўлёва, чаму вы ня пішаце нам аб падрыхтоўцы да сяўбы па раёну і ўдзеле ў гэтым сялянак, асабліва грамадчыц і дэлегатак. Пішыце нам аб мясцовых фактах падрыхтоўкі да сяўбы.

Златкінай. На запытаньні вашы адкажам праз часопісь. Допіс ваш друкаваць ня будзем, ён больш падыходзіць для насьценнай газэты.

Бунінай. Аб абглядзе скарыстаем, перавыбары Гарсавету друкаваць ня будзем.

Карнейчык. Аб перавыбарах савету— спазьнілася.

Асіповіч. Аб культ-бытавым паходзе—няма фактаў, пішыце што выяўлена ў час паходу.

Дорскаму. Ня пойдзе.

Гарулевай. Адзін допіс—выкарысталі. У дадатку няма нічога новага.

Ці ты падпісалася на „Белрабсялянку“? Не забудзь працягнуць падпіску да канца году зараз—будзеш удзельнічаць у вялікай лётарэі.

ЦЕНТР. ГОСБИБЛИОТЕКА Т.С.С.Р.
Инв. № 13

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Адрас рэдакцыі:
Менск, Савецкая вул., № 45.
Тэлефон № 419.

ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КОМУНІСТ. ПАРТЫІ (бальш.) БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 месяц . . . 15 кап.
„ 3 „ . . . . 45 „
„ 6 „ . . . . 90 „
На год . . . 1 р. 80 „

№ 6 (56) | Сакавік (март) 1929 г. | № 6 (56)

Укрепим производственную дисциплину, прочь расхлябанность и разгильдяйство!

XV партийный с'езд поставил перед всей партией, перед рабочим классом задачу — развивать социалистическое хозяйство так, чтобы мы догнали, а потом и перегнали капиталистические страны.

Только развивая индустриализацию страны, перестраивая сельское хозяйство на социалистический лад, трудящиеся массы Советского Союза выйдут победителями в жестокой борьбе с капиталистическим миром.

Дальнейшее улучшение материального положения рабочего класса и трудящегося крестьянства зависит только от того, насколько быстро будет развиваться наше социалистическое хозяйство.

Вот почему воля и энергия каждого сознательного пролетария и пролетарки должны быть направлены на борьбу за индустриализацию нашей страны, вот почему внимание каждой работницы должно быть приковано к поднятию производительности труда.

Партией и правительством БССР намечен рост продукции на 28-29 год на 51 проц. В промышленность в этом году должно быть вложено 40 миллионов рублей; зарплата должна повыситься на 8,1 руб. Все это возможно тогда, *если производительность труда в этом году увеличится на 25 проц., если себестоимость будет снижена на 7 проц.*

Между тем за последнее время производственная дисциплина на многих предприятиях ослабела, выросли прогулы. По данным Наркомтруда 90 проц. невыходов на работу—без уважительных причин. Наблюдается и большое количество прогулов на предприятиях с преобладающим женским трудом. На „Двине“ рабочий день использовывается только на 50—83 проц.

„Днепровская мануфактура“ выполнила производственный план только на 58 проц. Большая недовыработка имеется на очковой и на чулочной фабриках. На некоторых предприятиях во время работы работницы дерутся; на „Красной Березине“ работница Сурман ударила рабочего так, что тот 3 дня не ходил на работу. А как назвать такие возмутительные случаи, когда на чулочной фабрике пряжа была обнаружена в уборной.

Где причины падения трудовой дисциплины?

За последние годы в наши фабрики и заводы влились новые слои рабочих и работниц—выходцев из деревень, местечек и непролетарских слоев города. Эти люди, не привыкшие к точности, к порядкам заводской жизни, вносят ослабление производственной дисциплины. Партийные и профессиональные организации, рабочий актив, недостаточно борются с расхлябанностью, разгильдяйством на производстве.

Работницы и, в первую очередь, *актив—должны об'явить беспощадную войну всякому лодырничеству, прогулам и невыходам на работу.* Каждая сознательная работница должна раз'яснить своему товарищу, что плохим отношением к производству работница вредит делу пролетариата, что каждый прогул—это повышение себестоимости продукции. Между тем снижение себестоимости на 7 проц. по СССР составляет экономию на 700 миллионов рублей, которые должны быть вложены в нашу промышленность.

Там, где имеются делегатские собрания или вообще делегатки, вопрос о производственной дисциплине должен быть обсужден совместно со всем активом. Надо выяснить причины прогулов, простоев машин, надо об'явить решительную борьбу за выполнение правил внутреннего распорядка. Через производственные совещания, стенгазеты и общие собрания добиваться снижения брака и уплотнения рабочего дня. Каждый прогульщик должен рассматриваться, как дезертир рабочего дела.

Надо усилить воспитательную работу среди работниц, недавно влившихся в нашу социалистическую фабрику. Голос старых работниц, отстаивавших фабрику в годы гражданской войны, знавших „прелести“ работы на хозяйской фабрике—должен быть слышнее.

Все лучшее, сознательное, что есть среди работниц—на борьбу за укрепление пролетарской производственной дисциплины, на борьбу с разгильдяйством и расхлябанностью.

М.

Беспощадная борьба с прогульщиками! За поднятие трудовой дисциплины на предприятиях!

Работница, помни, что лодыри и прогульщики подрывают нашу промышленность.

РАБОТНИЦЫ—В ПАРТИЮ!

(Что сказал XII-ый с'езд КПБ об укреплении и чистке рядов партии).

С 5-го по 16-е февраля проводил свою работу XII-ый с'езд КПБ, которому пришлось на ряду с целым рядом важных вопросов: хозяйственного строительства—пятилетки, о профсоюзах, отчет ЦКК, отчет ЦК КПБ—обсудить один из главнейших вопросов—о чистке и укреплении рядов нашей партии.

XII-ый с'езд КПБ со всей решительностью подошел к вопросу о чистке нашей партии от разложившихся элементов и укрепления ее рядов (партии) лучшими рабочими, работницами, сельско-хозяйственными рабочими и работницами, батраками и батрачками.

Партия—это авангард рабочего класса, его передовая часть и, как полководец всего класса, партия всегда вела и ведет пролетариат и беднейшее крестьянство в союзе с середняком к конечной цели—коммунизму.

В настоящее время мы переживаем период социалистической реконструкции (переустройства) народного хозяйства нашей страны.

Мы должны переустроить наши заводы, фабрики, сельское хозяйство на основе более высокой техники. Для этого нам нужно улучшить и увеличить выработку промышленной продукции, а также производство разных машин как для предприятий, так и сельского хозяйства. Наша страна технически отсталая. Пролетарское государство должно подняться на более высокую ступень своими собственными силами. Это требует большого напряжения со стороны пролетариата и широких масс трудящегося крестьянства.



Батрак приветствует XII с'езд КПБ.

Это требует в первую очередь сплочения и укрепления авангарда пролетариата—партии.

У нас в партии имеются такие, которые пасуют перед трудностями и этим самым помогают нашим врагам—нэпманам и кулакам. У нас в партии имеются и такие, которые использовывают партию в своих корыстных интересах, которые забыли про интересы рабочего класса, обюрократились—разложились.

От таких партия должна очистить свои ряды—решил XII-ый с'езд КПБ. Ибо коммунист должен быть примерным и на предприятии, и в области поднятия трудовой дисциплины, производительности труда, и уменьшения себестоимости продукции, в борьбе с бюрократизмом, в борьбе с пьянством, в борьбе со старым, за новый быт.

Коммунисты в деревне должны быть, в первую очередь, организаторами коллективных форм хозяйства и, в первую очередь, самим итти в коллективы—**быть пионерами по социалистическому переустройству нашей деревни.**

Дать решительный отпор пробующему кой-где проникнуть в наши органы власти и общественные организации кулачеству—должен коммунист.

XII-ый с'езд на ряду с мероприятиями по очистке рядов партии указал пути укрепления и увеличения рядов КПБ.

XII-ый с'езд постановил, **что к 1930 г. у нас должно быть в КПБ 50%**, т.-е. половина всей партии—рабочих от станка.

Всего в КПБ на 1-е октября 1928 г. членов партии—**32329**, из них коммунисток—**3847 или 11,8** проц. (без военных).

Всего рабочих на фабриках, заводах и транспорте у нас имеется **61700**, из которых членов партии—**10.400**. Батраков и сельско-хозяйственных рабочих—**38396**, а коммунистов—**745**. Эти цифры говорят за то, **что расти за счет лучших рабочих и работниц партия может, должна и будет расти.**

О недостаточном росте количества работниц в партии нам говорят следующие цифры: в стекольной, спичечной, швейной, бумажной, трикотажной и текстильной промышленности занято—**5177** работниц, а коммунисток в этой промышленности только **538** или **10,5** проц.

Батрачек, только членов союза рабземлес на 1-е июля было **6217**, а в партии только—**69** или **1,1** проц. Ясно, что это чрезвычайно мало.

С'езд сказал, что надо создать более благоприятные условия бытового характера, ибо неустройство нашего быта является одним из тормозов к вступлению в партию работниц с большим производственным стажем, обремененных семьями.

В области вовлечения в партию батрачества парторганам придется в ближайшее время разработать ряд мероприятий и по значительному улучшению полит-работы среди батраков, особенно среди батрачек, облегчению приема их в партию, допуская в отдельных случаях подачу заявлений без предварительных рекомендаций.

Нам нужно поставить работу так, **чтобы окончательно вырвать работниц и батрачек из под мелко-буржуазного влияния, особенно батрачек—из-под влияния своих хозяев-кулаков.**

Рабочие и работницы должны изучать решения XII-го с'езда, и под руководством КПБ и в ее рядах—бороться против извращений классовой линии отдельными разложившимися элементами, помочь партии очистить свои ряды от таковых.

„Широкая вербовка в партию рабочих, с одной стороны, и чистка КПБ—с другой, еще больше укрепят ряды КПБ, еще теснее свяжут ее с рабочим классом для того, чтобы более быстрым темпом итти вперед, к социализму“—так решил XII-ый с'езд КПБ (из резолюции по докладу т. Василевича).

Будем осуществлять решения XII-го с'езда КПБ. Лучшие наиболее выдержанные работницы, батрачки и сел.-хоз. работницы войдут в ряды КП(б)Б.

Б. Дворецкая.

Ударим по шкурничеству. За деловое участие работниц в производстве.

Таким не место в партии.

Наша ячейка тоже не застрахована от разложившихся, случайно попавших в ряды партии, не желающих считаться с партийной дисциплиной.

Таких в ячейке четверо: Берковин, Крейвец, Янускевич и Гольман Злата. Все они члены партии с приличным стажем, но их поведение на производстве подрывает авторитет ячейки и партии в глазах рабочих.

Член партии—Крейвец—работница бросается партбилетом: „На черта мне ваша партия". Крейвец не платила членских взносов в продолжение 8 месяцев. Ходили к ней домой партийцы, уговаривали, пусть посещает собрания, уплатит членские взносы.

„Возьмите моего сына на завод—буду в партии, а нет, так и в партии не хочу быть".

Учиться даже не желает Крейвец.

Гольман Злата в партии с 1925 года, была в нескольких составах бюро ячейки, была делегаткой, женорганизатором, сменоргом и даже делегаткой на партконференции. Все-же Гольман безобразно ведет себя в цеху: доводит до слез работницу Чертову и других стоящих с нею за одним станком, клевещет, ругается самыми безобразными словами, сплетничает. Работницу Жук она обзывает: „Мужицкой мордой, польской харей".

Ячейка решила избавиться от Крейвец, как неподдающейся никакому воспитанию. По отношению к товарищу Гольман были на собрании настойчивые требования ее также исключить, но пока ее оставили в партии, ограничившись выговором.

Наша ячейка готовится к чистке партии, вынося на суд беспартийных рабочих—разложившихся, осуждая их скверное поведение на производстве, шкурничество, недисциплинированность.

Берман.

На первом плане горшки, а не производство.

Работницы хлебозавода в смотре производственных совещаний почти не участвуют. Со стороны работниц не поступило ни одного предложения во время смотра, в то время когда от рабочих нашего завода поступили десятки дельных предложений через специальную тетрадь и стенгазету. Даже памяток, розданных на руки, работницы не возвратили, такого же участия от них можно ожидать в самом производстве.

„У нас дети и горшки"—отвечают работницы, когда спрашиваешь, почему они не интересуются смотром.

Из всего этого видно, что партячейке и завкому еще много надо поработать над воспитанием наших работниц.

Б.

т. Малашенок—уборщица МББ, выдвинута слесарем.

Только разговоры.

У нас на фабрике „Днепровская мануфактура" очень много говорят о выдвижении женщин на административную хозяйственную работу. Судя по разговорам наших фабкомовцев, с выдвижением у нас благополучно, но не тут то было. За последнее время у нас выдвинули рабочего заместителем директора, шесть рабочих—подмастерьями, а теперь собираются выдвигать одного рабочего—мастером.

Почему же среди выдвиженцев нет ни одной работницы, может быть у нас их мало на фабрике?

Как раз обратное. Работницы у нас на фабрике составляют 75 проц., всех рабочих 800 человек. Есть работницы по своей квалификации далеко превосходящие мужчин, но беда в том, что, по мнению нашего фабкома—„они—женщины. Как они могут быть подмастерьями, лазить в пыли и масле, починять станок". На двенадцатом году революции наши фабкомовцы по старинке рассуждают: „Женщине надо детей рожать, готовить обед, да с мужем быть поласковее".

А ведь 8-го марта с какими глазами наши фабкомовцы и администрация говорят, запивая водой, страстные речи, об участии женщины в социалистическом строительстве наравне с мужчиной.

О выдвижении уже много писалось в местной и центральной печати. Теперь я обращаюсь к редакции журнала „Беларуская работніца і сялянка" с просьбой проделать что-нибудь для действительного выдвижения работниц у нас на фабрике.

„Ухват"

„Днепровская мануфактура",
Оршанский округ.

Жанчына—памоцнік станкавага.

У сьнежні месяцы па прычыне недахопу сыравіны была спынена праца бачарнага цэху, рабочых перавялі ў лесапільны цэх, які пусьцілі на другую зьмену.

У бачарным цаху нашага заводу працуе 9 жанчын. Дваіх з іх—Станішэўскую і Швэдаву вылучылі памоцнікамі станкавых. Хаця гэта праца паўкваліфікаваная, але дагэтуль дзяўчаты на ёй не працавалі. Калі запрацавала бачарка, работніцы з лесапілкі зьвярнуліся на ранейшую працу, а Швэдава і Станішэўская згадзіліся застацца ў лесапілцы—памоцнікамі станкавых.

Але на гэтым спыніцца нельга. Трэба заўкому паклапаціцца аб тым, каб вылучыць жанчыну для працы на фугоўцы ці да ўпорнага століка.

Алена Голуб.

Завод „Спартак".

Передовые работницы—в партию Ленина! Под руководством партии вместе со всем рабочим классом за дело победоносного строительства социализма!

Апавяданьне Галкі.

Над рэчкаю.

На голых вярбовых дубцах яшчэ баязьліва павылазілі срэбныя завушніцы. Рэчка нядаўна ажыла, задрыжала, пабегла будзіць жыцьцё. На беразе жанок маністамі нанізана—беляць палотны, ківаюцца, ляскаюць, жартуюць. Спрытна падскакае пранік па ганачкам складзеным губкам. Пачастуе кабеціна выпеставанае сваімі рукамі, нібы злосьць спаганяючы за многа бяссонных, марудных начэй; выпярэ аб ногі, трапыхне і па калючай веснавой вадзе разгорнецца шэрая сьцежка. Лясьне аб ваду, угару падніме. І выкручваць ня трэба, вада як з скуры зьбягае.

— Дзянёк сёньні ўдалы—дзявочы. Пашанцавала нам, сонейка, бач, як прыпякае. Усіх вас, дзяўкі, хлопцы любяць, бо ніводнай хмаркі на небе ня відаць.

Дзяўчаты ўсе гуртом зубы скаляць, прылумляюць.

— Мальвіна, хапай маё палатно, а то паплыве.

— Няўдалая, нязграбная! Зімачку круціла,—пальцы паабразілі, а зараз па вадзе пусьціла.

— Яшчэ і няўдалая, а сама зірні туды!

Наста бежкі на бераг.

— Аюць, воўк вас рэж!—крычала яна здалёк, адганяючы нечага подсьвінка, які мацаў лычом пасланае па бурай траве палатно.

— Кажы ты, і сьвіному лычу больш кужаль падабаецца. Нехай-бы абдзіркі сьвінча тузавала, тут-жа побач ляжыць. Далікатнае вабіць,—бурчала Настуля, кідаючы абярэмак палотнаў на бераг.

— Кужэльнае, бач, хваліцца. І так ведаем, што ў цябе рукі не ламакі. Многа нагатавала за зіму?

— Сама дванаццаць губачак толькі, ды маці...

— Кублоў ня хопіць.

— А Мальвіна, думаеш, менш настукала, глянь якое танюсенькае ды бялюсенькае.

— Мальві-і-іна! Каго табе абшываць? Ты да маці. Ня інакш як пасагу рыхтуеш. Хванабэрыцца, і ня зірне нават. Маль-ві-на!

— Ты таварышка! І дбаць ня дбае цябе Мальвіна. Абазвацца не жадае. А я вось старая, хоць, і ня з вашага гурту, а ведаю такое слова, што зараз як скажу яго, Мальвіна і вушы растапырыць.

— А я папярэджу. Ну, хто раней?

Аўдуля ляснула пранікам па вадзе, абсыпала Мальвіну халоднымі брызкамі. Тая разагнулася.

— Ну, хто першы?—з гонарам запытала яна.

Пад дзявочы рогат Мальвіна абцірала твар рукавом. А Зноўя старая рабіла сваю справу. Яна прыпыніла працу, падашла да Мальвіны.

— Навіна ёсьць. Хочаш даведацца? Скажы толькі, чым аддзякуеш старую.

— Навіна, цётачка, якая?—цікавіцца Наста.

— У-у, сарока! Каб навіна мая датычна была цябе, то я табе ёю і набівалася-б. Марш на свае месца.

— Не пайду.

— Як сабе хочаш. А я не скажу зараз. Пяры, пяры Мальвіна, пасьпеем нагаманіцца.

Заляскалі аб ваду, зашусталі палотны. Зноўя з кашалём апынілася каля Мальвіны.

— Я не жартую Мальвіна,—вяжацца Зноўя.—Госьці ў нас ёсьць у вёсцы.

Дзяўчаты старанна працуюць, ім і не ўпамкі, што да берагу ўсё бліжэй падыходзіў хлапец.

— Ай, пусьці, з жартамі сваімі ня к месцу. Пусьці, кажу! І дужае-ж якое. Гэлька, Зося, Грыпіна, хто гэта?

Але ззаду, падкраўшыся, хтось моцнымі рукамі шчыльна заплюшчыў вочы Мальвіны. Трымалі рукі, не давалі ня толькі разагнуцца, а нават паварухнуцца.

— Пусьці кажу, рукі стынуць у вадзе!

Вальней крыху адпусьціў. Мальвіна распрасталася. Толькі хацела павярнуць галаву, а пад сэрцам нешта стук...

Іскры пасыпаліся з вачэй. Задрыжаў лазьняк, зялёным прыкінуўся. У вушах зазванілі званы. Вачыма лупнула. Але зрадзілі ногі ў каленах, сталі мяккімі, гнучымі. З зачыненага роту пачулася толькі выціснутае м-м-м. Мальвіна з сьпірачам у руках падкошаная павалілася на зямлю.

Запішчалі дзяўчаты, абступілі ляжачую.

— Няўжо падучая?—шаптала Гэлька.

— Бясстыдніца! Адкуль ты ўзяла? За Мальвінаю ня было гэтага,—сароміла Зноўя.

— Міколак, галубчык, занясі Мальвіну дамоў. Гэта пройдзе, бывае. Во, так,—напявала старая Зноўя чырвонаармейцу чарнявому, які асьцярожна ўзяў самлелую Мальвіну і панёс дамоў.

Пад сэрцам варушыцца.

Сьнежань, студзень, люты, сакавік, красавік—плылі ў галаве Мальвіны месяцы блізкіх спатканьняў з Якубам. Неспадзяваная хворасьць яе мінула, але страшна было ўставаць, страшна пазіраць мацеры ў вочы. Мальвіна нярухома, з заплюшчанымі вачыма ляжала на ложку і разважала сама з сабою.

Ранішняя абмарока на рэчцы ператварыла здагадкі Мальвіны, у якіх яна баялася нават сабе прызнавацца,—у сапраўднасьць. Мальвіна цяжарная ад Якуба.

Што рабіць зараз? Хата ў Якуба не дабудована, а казаў ён: „Пакуль не дабудую хаты, аб вясельлі нечага і думаць". Але-ж хата, хата якая! Дамок гарадзкі, а ня хата. А наўкола палеткі. Во дзе разгарнуцца. Двор нібы лялька. Новыя, моцныя поўныя багацьця гумны, сьвіронкі, хлявы. А жывёлы,—стада цэлае. Ды якая жывёла! Ва ўсёй ваколіцы няма роўні Якубавай гаспадарцы.

Мальвіна ўяўляла шырэннае поле, з нівамі, нахіленымі пад цяжынёю збожжам налітых калосьсяў. Рукі мімаволі пасоўваліся пад коўдраю. Здавалася, што яна перасыпае з жмені ў жменю буйнае залатое зярно.

Расплюшчыла вочы. У хаце душна і цёмна. Столь абаперлася аб печ. Вакенца менш шыбкі новай Якубавай хаты. Над вокнамі брыжы з газэт. Столік з падзертым абрусам, дзьве лавы даўжэнныя—уся маемасьць Мальвінінай хаты.

Рот дзярэ смага—піць захацелася. Вось-бы малака, хоць паўшкляначкі! Абрыдла бульба з расолам. Вочы зачыніла. Зноў зьбегла на думкі Якубава стада сытых кароў.

А што як ня возьме, калі ацураецца?

Уздрыганулася. Па сьпіне прабеглі мурашкі.

Ён-жа зроду ня пройдзе са мною на людзях. Ходзіць толькі ў хату, калі мацеры дома няма. Кажа: „людзям ня трэба ведаць аб нашым каханьні". А з Настуляй усюды: на вячорках, музыках.

Ці я-ж роўня Настулі? Яе бацька казаў, што ў пасагу рыхтуе тры каровы і пару буланых жарабцоў. А ў мяне... Рукі ды пуза.

У сенцах нехта бразнуў вёдрамі. Гэта маці старая запасала ваду.

Мальвіна зьвярнулася да думак сваіх.

Сказаць зараз Якубу аб дзіцяці ці не? І цікава было-б даведацца, што ён скажа на гэтакую навіну. Але не, памаўчу. Усё роўна хаты ня скончыў. А пакуль няхай будзе невядомым для ўсіх. Маці ня скмеціць. Што-ж, што самлела. Хіба ня бывае такога з людзьмі?

Неяк боязна стала за погляд Якуба на тое, што ён ужо бацька таго, хто пачаў варушыцца пад сэрцам.

А Міколік, такі рахманы, лагодны. І чаму ён маўчаў, не даваў, не даваў даўно вестак? Уся вёска яго залічыла маім. Нават маці зяцьком называе Міколу. Гэты не хаваўся, за гонар лічыў па вуліцы побач прайці. Бо бедны, як і я, гадаваліся разам, на адным поплаве пасьвілі калісь сьві-

Узяў самлелую Мальвіну і панёс дамоў.

ней. Можа і лепш было-б, каб з Якубам сябе не зьвязала. Але ці я вінавата?! Чаго сам Мікалай больш паўгода маўчаў. Мо' ажаніўся ў Чырвонай арміі? Адкуль мне ведаць. А так я моцна кахала яго. Што мае быць, то ня мінуць.

Калі-ж бы ўздумаў Якуб ацурацца!..

Мальвіне нічога не балела, але з глыбіні грудзей у яе вырваўся енкат.

Рыпнулі дзьверы. У хату вайшоў Мікалай.

— Добры вечар!

Мальвіна маўчала.

Хлапец зьняў шынельку, шапку, павесіў над лавай. Азірнуўся па хаце. Прысеў на руб ложка.

— Мальвіна, ты сьпіш?

— Не. Добры вечар.

— Зноў стала жывым чалавекам. Чаго ты самлела? Нельга так раптам палохаць мяне і людзей. Ну і модна спатканьне ты мне нарыхтавала. Я так чакаў цябе бачыць, а тут, на табе, няжывую на руках прышлося ў хату нясьці. Што за жарты! Я з маленства ня бачыў за табою такіх выкрунтасаў. Мо' ты хворая?

— Не. Гэта так. Я здарова.

— Калі здаровая—устань, пасядзім, пагамонім. А гаварыць нам ёсьць аб чым. Хоць ты калісь ня ласа была на гаворку, але-ж я цябе доўга ня бачыў, сумаваў, многа думаў.

— А чаму ня пісаў?

— Зразумела, чаму. Меў прыехаць, зьвярнуцца. Ты-ж павінна была здагадацца, што хутка я буду не чырвонаармеец, а як і ты—селянін. Табе-ж вядома, што вінтоўка толькі часова ў руках, а там зноў за плужок, за касу.

Хоць і шкода было разьвітацца з казармай. Памятаеш, што я ледзь цягнуў па складам на ліпункце. А цяпер,—без газэты—ні шагу. Нават сам навучыўся ў газэты пісаць.

Зараз мы з табою зажывем. У цябе муж будзе здольны, сьвядомы, пісьменны. Праўда, Мальвіна?

Мікалай схіліў галаву над падушкайМальвіны. Ён рукамі схапіў яе і шчыльна прыціснуў сабе да грудзей.

— Ну, чаго-ж ты маўчыш? Абзавіся, скажы-што кольвек. Як жыла, з кім дружыла, ці здарова матуля, дзе яна заблудзіла што ў хаце няма?

Мальвіна перавярнулася, вызваліла сябе з абнімкаў Міколы.

— Ты сказаў, што зьбіраешся стаць маім мужам?

— А то як-жа? Тут няма навіны. Ты чаго так пільна ўзіраешся на мяне? Мо' ня люб стаў?

У паход с упроць цемры і балячак быту. Мільёны вачэй работніц і

Крэдытнае таварыства і КСУ дбае для заможнікаў.

(Што высьвятліў культбытпаход Лошніцкіх дэлегатак).

Ня гледзячы на будні дзень—дэлегаткі пакінулі кудзелю і пайшлі на сход. Прысугнічала 74 ч., з якіх 32 дэлегаткі.

Цікава вельмі паслухаць, аб чым будзе гаварыць вылучаная на мінулым сходзе камісія дэлегатак па абгляду бытавых устаноў. Камісій было пяць.

Камісіі абглядзелі працу спажывецкай і сельска-гаспадарчай каапэрацыі, КСУ, урачэбны пункт, пахадзілі і па хатах асобных дэлегатак абглядзець, ці сапраўды дэлегатка зьяўляецца першай па падрыхтоўцы да сяўбы, па ўходу за гаспадаркай, чыстатой, ліквідацыі няпісьменнасьці і г. д. Што яны высьветлілі? Як гэтыя ўстановы абслугоўваюць запатрэбаваньні сялянак?

Загадчык каапэратыву — Гец, прымешвае мякіну ў муку. Былі выпадкі, калі ён зусім адпускаў мякіну замест мукі матцы чырвонаармейца, у падводы браў сваіх родзічаў, кулакоў, а беднякам зарабіць не даваў.

Крэдытнае т-ва не забясьпечвала крэдытам беднату, а асабліва бяднячак. З 30 чал., атрымаўшых у крэдыт с.-г. машыны—11 беднякоў, 1 заможны і 17 сераднякоў, і толькі 2 жанчыны, у той час, калі ў вёсцы шмат адзіночак-гаспадынь—удоў і жонак чырвонаармейцаў, а ім адмаўлялі.

У грашовым крэдыту на пакупку каня бяднячцы адмовілі, а старшыня праўленьня самаўласна выдаваў крэдыт ня толькі моцным сераднякам, а нават і кулакам. Сярод іх: Палонік Уладзімер, Данілевіч, Хадасевіч Лука, якія маюць па 13—14 дзесяцін зямлі, па 3—4 каровы, сельска-гаспадарчыя машыны і г. д.

КСУ таксама ня досыць клапаціцца аб беднаце. У мінулым годзе раздаў на 330 рублёў аўса. Замест аўса атрымаў грошы, а зараз насеньня для беднаты няма. КСУ нічога ня робіць, каб забясьпечыць грамадзкую апрацоўку палёў беднаты, а асабліва бяднячак. Ні сваечасовай падрыхтоўкі да сяўбы, ні насеньня, ні каня, ні сельска-гаспадарчых машын. Замест гэтага КСУ склікаў сход, на якім казаў: „Калі знойдуцца бяднячкі *не гультаі*, такім КСУ дапаможа".

Дэлегаткі гэта назвалі кулацкай хлусьнёй, і зусім правідлова.

Пры раздачы апалу бяднячкі і ўдовы чамусьці забыты. За выдачу пасьведчаньня КСУ браў грошы з беднякоў.

Урачэбны пункт не апальваецца. Хворых слухаюць не разьдзетых, бо немагчыма інакш з-за холаду. Жанчын і мужчын абглядваюць у адным пакоі. На мойку бялізны адпушчана ўсяго 5 руб. на год, таму ўрачы працуюць у брудных халатах, а хворыя ляжаць у сваёй бруднай бялізьне. РВК да гэтага часу ня купіў

— Ты спазьніўся, Мікола.

— Што ты сказала?

— Спазьніўся ты.

— Я-ж верыў табе, Мальвіна, галубка, навошта жартуеш?

— Я кажу праўду, тое, што ёсьць.

— Кінь сваё глупства, дзявочыя штукі. Мы з табою ня сёньня знаёмы. Выраслі разам, разам любіліся, зроду ня кінем адзін аднаго. Адкладаць непатрэбна. Рыхтуйся да вясельля. Праз тыдзень чакай сватоў.

Змоўк Мікола. Сядзеў ціха. Нярухома ляжала Мальвіна. У галаве яе віхрам круціліся думкі.

Што зрабіць, як адмовіць? Ня варта пакрыўдзіць Міколу, ён-жа добры дружака, такі клапатлівы. І ніяк не зьмяніўся, той самы, як і раней, шчыры, просты.

Адмовіць—будзе крыўдна, балюча яму. А згадзіцца... Не, не. Не магчыма...

Запытае чаму, што здарылася. Сказаць—адчапіся, мая ўласная справа. Можа прызнацца, гэта адвабіць яго.

— Мікола, ты ня крыўдзіся. Я сказала—спазьніўся, бо ўжо шосты месяц, як я...

Мальвіна ня скончыла сказу. Абарвалася слова.

Мікалай скочыў з ложка, пачаў мераць падлогу ад стала да парога. Доўга па хаце хадзіў, мяў хустынку ў кішэні. Думкі так шпарка каціліся, беглі, што ніводную з іх нельга было затрымаць, раскусіць.

— А хто-ж бацька дзіцяці?—з некай злосьцю чужою, адарванай з болью, пасьля запытаў.

— Вядома ня ты.—Як сама да сябе адказала Мальвіна. Зноў затулілася ў хустку, бы схавацца хацела ад усіх і сама ад сябе. Пасьля ціха, неяк хрыпла, прагаварыла:

— Мікалай, ты ідзі лепш дамоў. Мне сёньні, пасьля рэчкі, вельмі вабіць самой адпачыць.

— І то праўда. Ня вяжуцца словы. Мо' я глупства табе нагаварыў.

Паглядзеў на Мальвіну як на разьвітаньне, як едучы ў невядомую адлучку на доўгі час. Блізжэй падышоў, у вочы заглянуў. Хацелася цёплае слова сказаць, ды нічога ня вышла, ніяк ня прыдумаў. Толькі руку паціснуў да болі.

— Я ня буду табе дапякаць. Ты мне толькі скажы, хто ёсьць бацька дзіцяці—чалавек, ці зраднік. Зноў кажу табе, даю абяцанку, што зроду ня ўспомню. Ты толькі прызнайся. Хто бацька?

— Гэта справа мая,—адказала Мальвіна.—Ня выпытвай, бо я не скажу. А сватоў пасылаць і ня думай, я аб гэтым цябе прашу, бо шаную цябе як і калісь.

— Ня скажаш?

— Не.

— Ну, як хочаш.

Мікола ўздыхнуў. Усё, што ў хаце было, здавалася прыкрым, кпіны ладзіла ўсё з яго думак, надзей.

— Назаляць я табе больш ня буду. Я ня здолен цябе прымушаць. Чужым стаў. Бывай.

Вышаў з двара. Нават не азірнуўся.

А далёка, за талаю рэчкай, вясну заклікалі дзяўкі.

(Працяг будзе).

Пажадана каб на старонках часопісі выказалі свае думкі аб зьмесьце гэтага апавяданьня.

сялянак будуць сачыць за працай культурна-бытавых устаноў.

урачу спэц. вопратку—кажух, валенцы, таму ён адмаўляецца выяжджаць у халодныя дні. У каго ёсьць свая шуба, каб даць урачу ў чым ехаць, той атрымлівае дапамогу. Урач мае права выдаць у дзень 27 рацэптаў, каштоўнасьцю па 7 кап. кожны. Пагэтаму выходзіць, што хворы прымушаны некалькі разоў хадзіць за 5—6 вёрст, каб атрымаць столькі, колькі яму патрэбна.

Дэлегаткі прынялі шэраг мерапрыемстваў па дапамозе ў сваячасовай падрыхтоўцы да сяўбы бяднячак. Коопэравалі к 8 сакавіка за кошт спажывецкай коопэрацыі 18 ч., сельска-гаспадарчай—7 і КСУ—4.

У частцы дэлегатак у хатах чыста. Амаль каля паловы жыве ў брудзе. Дэлегаткі парашылі запрасіць санітарнага ўрача, каб ён прачытаў лекцыю аб чыстаце, як вывесьці клапоў, тараканаў і інш.

Дэлегаткі парашылі арганізаваць на лета дзіцячыя яслі і паказальны агарод.

Мы ўпэўнены, што дэлегаткі і ў далейшым будуць шчыра працаваць і вучыцца для сацыялістычнае перабудовы нашай вёскі. А пакуль у нас будуць гразь і цемра—канчаткова сацыялізму не пабудуем.

Усе на барацьбу за культуру!

А. Сапун.

Пора развернуть культурно-бытовой поход.

У нас на предприятии культурно-бытовой поход только начинает разворачиваться. Выделена комиссия, в которую вошли 5 работниц и 2 рабочих.

Культурно-бытовой поход должен будет не только выявить, но и устранить недостатки нашего быта.

По-моему во время похода нужно изучить возможность ввести вечерние смены в яслях, чтобы работница, кончив работу, не спешила за ребенком в ясли, а могла спокойно оставаться на собрании, в клубе, на совещании. А то получается: с работы к ребенку, а для общественной работы и времени нет. Кроме этого, если не удастся совсем устранить, то надо хотя-бы сократить очереди в кооперативных лавках. Очереди также много времени отнимают у работницы. Почитать-бы, а тут нет, приходится бежать очередь занимать.

Сократить очереди возможно при лучшем подборе приказчиков.

Больной вопрос у нас—еще общественное питание. Цены на обеды далеко не доступные для семейных людей. Кроме того, в столовых грязно, неуютно. Например, 1-я столовая далеко не приспособлена для того, чтобы можно было посидеть, почитать, отдохнуть во время обеда. Там всегда мрачно, обслуживающий персонал в халатах не первой свежести.

Дорская.

1-я типография,
Минск.

Нет медикаментов, чистота не ахти.

Комиссия, выделенная из работниц и жен рабочих обувной фабрики, обследовала детский приемник, находящийся на углу Университетской и Пролетарской. Дети рассказали комиссии о плохом отношении врача, обслуживающего приемник. Выявлен также недостаток таких необходимых медикаментов, как иод, вазелин, бинты; поэтому есть случаи, когда дети бегают с открытыми царапинами.

Помещение сырое, опущенное—необходим ремонт, т. к. с потолка течет вода. Не может похвастать приемник и чистотой: уборку производят дети, а и сами они далеко не чистенькие.

30 копеек, которые отпускают в день на ребенка—недостаточно.

Это обследование дало возможность работницам и женам рабочих глубже заглянуть в жизнь приемника.

Обследователям помогала сама детвора, рассказывая комиссии об условиях своей жизни.

С. Осипович.

Отсталая женщина—никудышная мать и хозяйка.

„Мне муж не говорит о собраниях, он считает что мне там делать нечего“—рассказывает жена рабочего хлебозавода—Шкленник. А рабочий—Гурвич откровенно заявил: „Если вы дадите мне 200 рублей в месяц и то я с ребенком дома не останусь.

Вот что выявили мы, обследуя быт жен рабочих нашего завода.

Есть жены рабочих, далекие от общественной жизни, а все это потому, что мужья не только не помогают женам развиваться, но даже отталкивают их от общественной работы. Мужья считают, что воспитывать детей и варить обед можно и без женских собраний.

На совещании актива все пришли к заключению, что обследование быта жен рабочих вполне оправдало себя, оно оживило работу. Жены рабочих более аккуратно стали посещать собрания.

Я считаю, что такие обследования быта полезно было-бы провести и другим предприятиям.

М. Бунина.

Хлебозавод
Минск.

Ліквідацыя няпісьменнасьці у камуне „Зорка“.

Шпарчэй да сацыялісты

Актывісткі на каапэратыўным зьезьдзе.

З глухіх далёкіх куткоў Савецкай Беларусі з акруговых і раённых гарадоў зьехаліся жанчыны-актывісткі спажывец. каапэрацыі.

На зьезьдзе іх больш 200 чалавек—маладыя дзяўчаты з юным задорам, з жаданьнем ледзь ня зараз перавярнуць увесь сьвет, пабудаваць сацыялізм, дарослыя кабеты з такім-жа імкненьнем, але гэтыя кажуць—„Масква не адразу пабудавалася (т. Ханчэўская), патрэбен час, патрэбна напружаная праца ўсяго вялікага каляктыву працоўных гораду і вёскі, каб выканаць наказ Ільліча“,—гэта голас дарослых актывістак.

Па аднаму толькі дакладу старшыні праўленьня Белкаапсаюзу т. Наўлянскага дэлегаткі зьезду засыпалі апошняга цэлым морам пытаньняў: падалі больш 200 запісак і ў кожнай ад 1 да 6—8 пытаньняў.

Мы не памылімся, калі скажам што на ўсіх дакладах дэлегаткі зьезду падалі дакладчыкам куды больш 1000 пытаньняў.

Адна за аднэй выходзяць жанчыны на трыбуну і ў сваіх прамовах закранаюць усё што ў іх нахварэла ў працы і жыцьці на мясцох.

Дэлегатка Ісакава з Аршанчыны кажа, нам дзяржава дапамагае, а мы ўсе яшчэ бедны,—трэба, кажа яна, ісьці ў камуны, бо толькі ў каляктыве мы зможам палепшыць свае жыцьцё. Т. Ісакаву падтрымалі шэраг выступаючых дэлегатак, адзначыўшых, што толькі праз колгас, праз вытворчую каапэрацыю сялянская бедната і сераднякі прыдуць да лепшай будучыні.

Дэлегатка Левіна—калгасьніца з Гомельшчыны, яшчэ больш падняла настрой прыхільніц каляктыўнага жыцьця.

„Раней, кажа т. Левіна, у нашым калгасе было цяжка жыць, а зараз мы ўжо вольна ўздыхнулі. Мы так паднялі сваю гаспадарку, што сёлета здалі каапэрацыі 600 п. хлеба, арганізавалі маслабойку, штомесяц даем каапэрацыі 15 п. масла“.

Т. Галіцкая кажа, што ў іх калгасе жанчынам жывецца куды лягчэй, чым было на сваіх гаспадарках. „Нам, кажа яна, ёсьць на каго пакінуць дзяцей, каб прымаць удзел у грамадзкай працы. Не палохаемся мы і таго, што застанемся без хлеба, бо гаспадарку каляктыўна паднялі і нам зямля дае большы ўраджай“.

„Мы не павінны чакаць, а трэба самім узяцца актыўна за падрыхтоўку да сяўбы“, заявіла дэлегатка Громава. Шмат дэлегатак дзяліліся сваім вопытам, як яны дабіліся павялічэньня ўраджайнасьці, хто перайшоў на шматпольле.

Т. Мардашова гаворыць — я чысьціла насеньне 2 гады, і гэта дало добры ўраджай.

Пры Міколе, кажа, я была батрачкай, а зараз ужо падыходжу пад серадняцку. У нас часта скардзяцца—таго няма, гэтага няма, а вось у нас ёсьць: і насеньне лёну-даўгунца, ёсьць аграном, які праводзіць працу—бо мы, дэлегаткі, каляктывам угнаілі палоску папелам, засеялі лён і сабралі добры ўраджай насеньня лёну-даўгунца.

Дайце аграномаў, дайце танную карысную кніжку, дапамагайце беднаце і серадняком арганізавацца ў калгас, у вытворчую каапэрацыю.

В. Зайцаў.

ВЕС

У садочку на тыночку
Заклікае целегоз:
— Уцякла зімы сарочка,
Пакінь сані, бяры воз.
Ад цямна да цёмна людзі
Каля „Трэйера“ кішаць,
Вясна кліча:—Не марудзіць,
Яравое рыхтаваць.
Улюта—жонка ня дурная,
Пальца ў рот не пакладзеш,
Яна вёсцы напявае:
— Што пасееш, то пажнеш.
Годзі сьмецьце жменяй ў полі
Па загонам раскідаць,
Як мага насеньня болей

Павязем пе
Ціт—кулак
— Ну і ла
Ганіць, лае
Не пад густ
А бяднячкі
Дбаць ня д
У каляктыў
Ліпнуць гу
— Межы д
Недзе рукі
Я скажу та
Так далей
Устанеш д
Задыбаеш

ПРАЗ КААПЭРАЦЫЮ

Зьверху: делегаткі зьезду т. Громава, Антаненка, Карзун і Левіна.

Зьнізу: 1—т. Крэмер і Васілевіч сярод дэлегатак зьезду, 2—прэзыдыум і агульны выгляд зьезду.

...ваш перабудовы вёскі

С А В Ы Я.

...шчаць.
...вухам чэша:
...стаў для нас.
...і брэша,
...калгас.
...рухі
...ць кулакоў,
...на мёд мухі
...з ўсіх бакоў.
...ць поля паскі,
...лажыць.
...араска,
...нельга жыць.
...та, а покуль
...альлі—

Сонца пачне жмурыць вока,
Працаваць няма калі.
А каб ўсю нашу зямельку—
І паля і сенажаць—
Згуртаваць—было-б дзе сеяць,
Але было-б чаго жаць.
Сельсаветчыца—Адарка
Кажа:—Годзе сьпінам ныць,
Загудзе ў полі жняярка—
Гуртом лёганька набыць.
Адабрала нам машына
Зерня буйнае, як боб.
Ўзрасьце збожжа—не мякіна,
Абярэмак—адзін сноп.

Г—а.

Як яна арганізавала чырвоны абоз хлеба.

Яна—гэта сялянка-бяднячка Сьцелькіна Хвядоска. Зараз працуе сябрам праўленьня Клімавіцкага гарадзкога спажывецкага таварыства (Магілеўшчына).

— Я, — кажа цётка Хвядоска,—беспартыйная, але ў актывістах ужо многа год. Не магу сядзець за кудзелей, калі бачу, як навакол ідзе такое валізарнае будаўніцтва новага жыцьця. Была і сябрам сельсавету, і членам райвыканкому, а зараз займаюся па каапэрацыі, бо гэта блізкая нам, кабетам, праца.

— Кажу я сваім праўленцам,— не магу я так сядзець, калі трэба для дзяржавы хлеб загатаўляць. Паеду ў вёску, арганізую сялян у чырвоны абоз з хлебам, — прыхожу да хаты і да свайго дзеда...

— Ну, дзед, запрагай нашу падлу, паедзем з табой у вёску Цімохава.

— Чаго, чаму, навошта?

— А ты, кажу, не чавойкай, а хутчэй запрагай каня.

Пабурчэў крыху, але праз гадзіну паехалі. Вось і ў вёсцы, Цімохава, Клімавіцкага раёну. Трэба сказаць, што ў вёсцы ў большасьці сяляне—беднякі. Пайшла па хатам: з тым пагутарыла, таму растлумачыла, што трэба Савецкай уладзе дапамагчы, бо яна нам больш дапамагае.

Адным словам, і беднякі і сераднякі—усе пакрыху раскачаліся, і на другі дзень арганізаваўся чырвоны абоз з 28 падвод, сабралі каля 200 п. хлеба і з чырвоным сьцягам прывезьлі у Клімавіцкае аддзяленьне „Днепрасаюзу".

Вось прыеду са зьезду да хаты, дык зноў вазьмуся за арганізацыю чырвонага абозу.

ПЕРАБУДУЕМ НАШ БЫТ

Сялянкі-будаўнікі каапэрацыі

У мінулым годзе ў складзе малочных таварыстваў было ўсяго 58 жанчын, а ў гэтым—колькасьць іх узрасла да 804-х. Па ініцыятыве жанок вёскі Гарань Заслаўльскага раёну было зарганізавана малочнае таварыства з 140 пайнікаў, з іх 101 жанчына. Старшынёю таварыства працавала таксама жанчына.

Акрамя гэтага, было арганізавана яшчэ 2 таварыствы. Для скарачэньня накладных выдаткаў усе тры малочныя таварыствы былі зьліты ў буйны завод.

Гаранскія жанчыны павінны быць добрым прыкладам удзелу жанчын у малочнай каапэрацыі.

Казючыц.

Думка жаночага актыву.

На бабруйскай канфэрэнцыі каапэратыўнага жаночага актыву прысутнічала 85 жанчын-упаўнаважаных і сябраў лавачных камісій.

Канфэрэнцыя вынесла шэраг важнейшых пастаноў: зьнішчыць чаргу ў каапэратыве, пашырыць сетку бытавых устаноў (дзіцячых ясьляў, пляцовак, сталовак). Дэлегаткі канфэрэнцыі выказвалі думку аб тым, што кожны працаўнік крамы павінен мець асобны выхадны дзень, гэта дасьць магчымасьць скарачэньню чаргі. Неабходна сыстэматычна склікаць нарады пайнікаў і працаўнікоў крам; таксама неабходна правесьці курсы каапэратыўнага актыву.

Палісава.

Закрепим нашу связь.

В Международный Женский Коммунистический День—приехали в Минск Харьковские работницы по приглашению Минского Окружкома КП(б)Б. Десятки тысяч работниц Харькова послали трех т. т. ознакомиться с работой и бытом работниц Минска.

Вот кто они: **Михайлова**—квалифицированная работница трансформаторных катушек Харьковского гиганта „Электросила", где занято 7.000 рабочих, из них 850 работниц.

т. **Семененко**—работница канатной фабрики им. Петровского, на которой из 4.500 рабочих—3.000 работниц. Работает она на этой фабрике 23 года.

т. **Данилова**—работница картонажнай фабрики им. 8-го марта. Из 400 рабочих—300 работниц.

...— да, знаете,—говорят они,—приняли нас тут очень хорошо, но хочется домой скорей—в Харькове теплее...

А вообще поездкой мы довольны. Кой-чему у вас научимся, кое о чем и вам расскажем.

— Нравится нам, что вы имеете в некоторых клубах постоянные детские комнаты, и что специально к 8 марта, такие комнаты были организованы, чтобы матерям можно было участвовать в празднике. А вот скверновато у вас с охраной труда. Были мы, правда, только на нескольких предприятиях, у швейников, например:—есть вентиляция, а комнаты скверно проветриваются. Во время обеденного перерыва некоторые рабочие остаются в цехах и заготавливают себе материал.

Работники женотдела ЦК КПБ, редакции „Белрабселянки" совместно с делегацией харьковских работниц.

Мы во время обеда совершенно очищаем помещение. Раскрываем вентиляцию, окна, душники. Столовки у нас есть. Обеды хорошие. У нас на картонажной фабрике производительность труда хорошая,—говорит т. Данилова.—Подгоняет коллективная сдельщина. Работницы выдвинуты на общественную работу:—председатель производственной комиссии, председатель фабкома, секретарь фабкома. Смотр работы производственных совещаний у нас прошел слабовато.

Хотя у нас большинство работниц—молодые, а учиться подлениваются. До 35 лет около 30 проц. неграмотных. **Боремся со злостными прогульщиками.** За последнее время у нас уволено 4 чел. неисправимых „гуляк".

Производительность труда поднялась. Раньше за 8 час. вырабатывали 7.000 коробок, а теперь за 7 час.—9.000 (перешли на 7-часовой рабочий день). Значительно экономнее начали расходовать картон, обрезки утилизируются.

У нас на „Электросиле",—говорит т. Михайлова,—бытовые условия тяжелые. Нет прачешной, квартирный кризис. Экономически хорошо обеспечены. Заработок рабочих в среднем 110 руб., средний заработок работниц 90 руб. Есть работницы высоко квалифицированные—бригадиры и проч. Переводят работниц на высшую квалификацию. Отношение рабочих к этому делу хорошее. А вот национальная рознь еще далеко не изжита. Национальный состав рабочих на заводе очень пестрый (всего около 30 национальностей), среди них украинцы, греки, татары, турки, калмыки, евреи и т. д.

Недавно осудили одну работницу на год за антисемитизм. Рабочие считали этот срок малым. Требовали больше. Прогулов много.

— И у нас на канатной гуляют, аж а-я-яй,—заявляет т. Семененко. Симулируют заболевания. Стоит машина: спрашиваешь, чего не работаешь?—А может я заболела!? И действительно, на завтра она на работу не приходит. Натрут, неяк, градусник, и вот тебе повышенная температура. Сознательные работницы борятся с этим. У нас большинство работниц живет в деревне. Организовали мы в подшефном сельсовеце ясли. Есть у нас выдвиженки. Помдиректора работница, на профработе и т. д. Еще много у нас ценностей пропадает на наших предприятиях. Наш хозяйский глаз должен стать зорче,—заявляют они все.

Харьковские работницы при перевыборах Горсовета организовали специальные группы налетчиков на различные учреждения. В результате вычищено свыше 500 чел. разных бывших людей (офицеров, священников, жандармов и т. д.).

А связь с вами поддерживать будем. Правда, нужно сознаться, что стенкорок у нас еще мало, хотя есть стенгазеты на наших предприятиях.

А все-таки,—говорит т. Семененко,—растем.

Вспоминаю при хозяине—...

Теперь мы и ругаться гораздо меньше стали,—смеясь заявляет т. Данилова.

А работать еще нужно „щыро"—не покладая рук,—улыбаясь говорит наша „старуха" Семененко. Прощаясь, т. Семененко говорит мне:

—а бороться с симулянтами и прогульщиками будем.

Да, будем и должны обязательно.

Ермолаева.



Таннуюкніжку па палавому пытаньню ў вёску!

Пабольш літаратуры для вёскі па палавому пытаньню.

Прачытаўшы заметку „Слова за работніцай і сялянкай“ я лічу неабходным выказаць маю думку. Пытаньне вельмі балючае, асабліва для сялянак. У горадзе маецца пад рукамі юрыдычная кансультацыя, дзякуючы гэтаму гарадзкія жанчыны бліжэй да нагляду рэвалюцыйнай законнасьці. Часамі атрымліваецца агідная цяганіна судовых органаў па разгляду алімэнтных спраў, нядбалыя адносіны судвыканаўцаў і ў дадатак кпіны з боку асоб з кулацкай ідэялёгіяй „распусьніца з байструком“. Трэба перажыць усе гэтыя зьдзекі, каб уявіць сабе кашмарнае становішча сялянкі. Часта амаль палова сялянскіх хлапцоў будуюць свае хлусьлівае каханьне да пары, пакуль дзяўчына згадзіцца ўступіць з ім у палавую сувязь. Калі хлапец даведаўся аб тым, што дзяўчына цяжарная—каханьне абрываецца і ён зараз-жа намаўляе яе зрабіць штучны выкідак.

З-за сарамлівасьці дзяўчаты ідуць за дапамогай да „бабкі“, а гэта небясьпечна для здароўя і наогул для жыцьця, а таксама выклікае матар'яльную страту.

Дла палягчэньня становішча жанчыны я прапаную наступнае:

Павесьці культурную працу на вёсцы, праз вясковы актыў—растлумачэньне адрозьніваньня між царкоўным і грамадзкім шлюбам, што шлюбнае і ўнешлюбнае дзіця—роўныя, а слова „байструк“ павінна адмерці разам з сарамлівасьцю за пазашлюбнае дзіця.

Зрабіць больш даступным штучны выкідак, для гэтага павінна быць дастаткова пасьведчаньня, што дзяўчына ня шлюбна, яе згоды і калі гэта не пагражае жыцьцю маткі. Доктар павінен рабіць выкідак, і толькі ў бальніцы.

Растлумачыць сялянскай моладзі праз мэдпрацаўнікоў, аб самых простых і даступных способах прыбераженьня ад цяжарнасьці.

Прасунуць у вёску танную, на даступнай мове, літаратуру па палавому пытаньню, з якой вёска амаль зусім незнаёма.

Паскорыць разгляд алімэнтных спраў, імкнуцца больш прысуджваць платы на дзіця; усе справы вырашаць на карысьць жанчыны. Лепш прысудзіць дзесяці распусьніцам, чым адказаць аднэй сапраўды гаротнай дзяўчыне.

Трэба, каб па гэтаму пытаньню выказалася больш работніц і сялянак БССР.

М. З. Маліноўская.

Саўгас „Дым“, Менскай акр.

Плаціць дзяржаве

У нашай вёсцы хаты-чытальні няма. Сабралася нас кабет 10 у мяне ў хаце, прачыталі артыкул аб алімэнтах. Усе жанчыны згаджаюцца з тым, каб абое плацілі дзяржаве, а дзіця забіралі ў прыют. Бо калі хлапец будзе плаціць, а дзяўчына—атрымоўваць сродкі, дык дзяўчына будзе яшчэ больш распуснай. Калі хлапец будзе плаціць дзяўчыне, ён прыме шэрагмерапрыемств, каб зьнішчыць дзіця з сьвету. Быў у нас такі выпадак, калі хлапец, каб пазбавіцца ад алімэнтаў, атруціў дзіцё.

Таму наша думка такая: плаціць абаім дзяржаве, дзяржава-ж выхоўвае дзіцё. *Кананучанка Ганна.*

Х. Града, Жыткавіцкі раён.

Заўвага: Рэдакцыя просіць паведаміць прозьвішча хлапца, які атруціў дзіця, і паведаміць ці быў ён пакараны.

Плаціць са сваёй часткі маемасьці.

Алименты мужчыны платить должны, только со сваей части имущества, ибо остальные члены двора не должны отвечать за другого. Если женщина родит ребенка от женатого, ей плотить алиментов не нужно. Если замужняя женщина родит от холостяка—ей также не нужно платить алиментов, а его нужно штрафовать в пользу государства, а дитя мать должна сама воспитывать, таково мое мнение.

Ус. Акулина.

Дер. Лесок.

Отвечай за себя.

Советская власть проводит действительное раскрепощение женщины, а законом об алиментах защищает интересы матери и ребенка. Закон вполне правильно обязывает обе стороны обеспечить ребенка. По моему т. Зоркая глубоко не права. Имеет ли смысл взвалить на плечи государства заботу *о случайно прижитых детях.* Безусловно—нет.

Наше государство пока еще не может охватить детей детучреждениями. Государство, взяв на свое попечение дитя, этим самым развязывает женщине руки и ничто не может помешать ей так свободно, через известный период времени, преподносить обществу новый „сюрприз“. С защитниками алиментщиков как, например, т. т. Вусько, Маяк ни с группой селькоров из Глуского района я ни в коем случае не согласен. Несправедливо и нелогично валить все на одну женщину. Мы—представители „сильного пола“ не имеем на это никакого морального права. Я говорю, что в 90 случаях из ста—виноваты оба. И если всласть покатался, то не должен пенять, если его заставляют саночки возить.

Г. Дорский

падвоім ураджай

Як жанчыне набываць сельска-гаспадарчыя веды.

Законам Ураду БССР аб павышэньні ўраджайнасьці і вытворчасьці сельскае гаспадаркі прадугледжваецца шырокая агранамізацыя насельніцтва. Вызначаны і спосабы прасовываньня агранамічных ведаў у гушчыню насельнніцтва. Так § 19 закону выразна кажа: „Для максымальнага разгортваньня ўсіх агрыкультурных мерапрыёмстваў у бліжэйшае пяцігодзьдзе на грунце шырокай агранамізацыі гаспадарчага насельніцтва...

в) Забясьпечыць па лініі мясцовага бюджэту асыгнаваньні сродкаў на арганізацыю сельска-гаспадарчых курсаў для дарослых сялян.

г) Забясьпечыць выданьне і шырокае распаўсюджываньне сярод насельніцтва навукова-папулярных і танных брашур па ўсіх галінах сельскай гаспадаркі і колектыўнага земляробства.

Зусім зразумела, што каб распачаць гаспадарыць па новаму, каб гаспадарку зрабіць больш культурнай і даходнай, неабходна і самаму гаспадару і яго жонцы і дзецям стаць больш культурнымі, больш адукаванымі, і ў першую чаргу адукаванымі па сельскай гаспадарцы. Усе новыя, навуковыя прыемы тэхнікі застануцца пустымі гукамі, калі іх ня будзе ведаць вясковае насельніцтва. Больш таго, ёсьць цэлы шэраг аграномічных мерапрыемстваў,



Перачыстка насеньня ў камуне „Зьвязда".

якія ў адных умовах клімату і глебы даюць вялікія сталыя вынікі, а ў некаторых умовах тыя-ж мерапрыемствы даюць адваротныя вынікі. Адсюль зразумела—ня ўсе парады аграномаў ў кніжках і часопісях можна проста і з пэўнасьцю ажыцьцяўляць у кожнай гаспадарцы ўсіх куткоў Беларусі. Над кожным мерапрыемствам трэба падумаць, каб засьцерагчыся ад шкоды.

Галоўныя шляхі набыцьця с.-г. ведаў—с.-г. курсы і с.-гаспадарчая навукова-папулярная літаратура. Плянам Наркамзему на 1928-29 г. намечана правесьці сіламі мясцовага аграпэрсаналу 410 курсаў па ўсіх раёнах БССР. Гэта ў сярэднім больш як па 4 курсаў на раён. Праз гэтыя курсы мяркуецца прапусьціць ля 16.000 вясковага насельніцтва, галоўным чынам вясковага актыву. Частка курсаў ужо праведзена зімою, а 41 курсы, працяжнасьцю ня менш месяца, мяркуецца правесьці да 10-га красавіка. З гэтага ліку курсаў намечана 15 для ўпаўнаважаных колгасаў, 4 для комсамольскага актыву (пры Беларускай с.-г. акадэміі і 3-х тэхнікумах) і 22 курсаў для ўпаўнаважаных пасёлкаў і вёсак.

Вось і трэба дамагацца, каб у гэтыя курсы быў уцягнуты жаночы актыў.

Акрамя таго, пасьля сканчэньня веснавога севу, у пэрыяд з 1-га чэрвеня да 1-га кастрычніка, мяркуецца праводзіць курсы для партыйнага, комсамольскага, савецкага актыву. І на гэтых курсах трэба дамагацца, каб быў замацаван пэўны процант за жанчынамі. Урад БССР даў заданьне нашаму выдавецтву ў гэтым годзе надрукаваць ля 200 кніжак па сельскай гаспадарцы. Зараз такая літаратура пішацца нашымі аграномамі і дасьледчыкамі, частка ўжо друкуецца і хутка выйдзе ў сьвет. Сьпіс надрукованае літаратуры мы дадаем асобна. Акрамя таго, будзе выдадзена спэцыяльная сэрыя с.-г. кніжак для жанчын.

Вось і трэба сачыць за тым, калі будзе выходзіць тая ці іншая мясцовая кніжка, зараз-жа яе набываць і ўважліва чытаць і вывучаць яе.

Зараз-жа мы асабліва-б раілі чытаць сельска-гаспадарчы аддзел часопісі „Беларуская работніца і сялянка", які зараз значна пашыраецца. Таксама шчыра раім усім сялянкам выпісаць спэцыяльную с.-гаспадарчую часопісь „Плуг"—адзіную і вельмі каштоўную ў Беларусі. Каштуе на год толькі 2 р. 20 к., а на поўгода 1 р. 10 к.

Акрамя пералічаных шляхоў папаўненьня с.-г. ведаў, сялянкам трэба зьвярнуць увагу на гурткавую працу. Паасобку, без кіраўніка цяжка вучыцца і можна шмат чаго не зразумець, а вось калі вы будзеце вучыцца каляктыўна, дык вам будзе лягчэй вучыцца. Трэба наладзіць гурткавую чытку кніжак і часопісаў і іх стала разьбіраць, запытваючыся адна ў другой, аб чым тут напісана і што трэба практычна рабіць. Калі чаго не зразумее адна, дык дапаможа другая. Такія заняткі можна праводзіць і пад кіраўніцтвам настаўніцы і кіраўніка дэлегацкага сходу. Тые-ж практычныя веды, якія аднагалосна прызнаюць усе ўдзельнікі гуртка, што яны могуць быць карысны і для вашых гаспадарак, трэба ўсім разам паспрабаваць ажыцьцявіць у сваіх гаспадарках і параўнаць, у каго лепшы вынік, а ў каго дрэнны.

Аграном **М. Лапкоў.**

СЯЎБА НЕ ЗА ГАРАМІ!

Працоўная сялянка, правер, што зрабіла ты для таго, каб павысіць ураджай у сваёй гаспадарцы.

т. Анішчанка зьбірае 75 пуд. жыта з 3/4 дзесяціны.

Дэлегатка зьезду—сялянка вёскі Ваўколава (Дубровенскі раён, Аршаншчына) Анішчанка Агрыпіна апавядала, як яна дабілася ўраджайнасьці.

— Зямелькі ў нас, — кажа т. Анішчанка,--усяго 5 1/2 добрай. Бачым, што па-дзедаўскі працаваць, дык далёка ня ўедзеш. Пачалі ў нас ў вёсцы агітаваць за шматпольле, — аграном прыяжджаў. Гэта было яшчэ ў 1919 г.

Што за шматпольле, ня ведаем, а бачым адно—па-старому гаспадаркі не падымеш. Паслухалі агранома і ўвялі шматпольны севазварот. Пачалі сеяць канюшыну, віку; аграном прыяжджаў, дапамагаў парадамі, ды і самі з мужам кніжкі пачытвалі. Пачалі карміць карову па норме,--бачым удой малака павялічыўся.

Раней з дзесяціны бралі 40—45 пуд. жыта, а сёлета з 3/4 дзес. сабралі ужо 75 п.; аўса раней зьбіралі на лепшы канец 45—50 п. з дзесяціны, а зараз з 3/4 дзес. бярэм 86—90 п. Бульбы з такой самай плошчы сёлета сабралі 760 п., канюшыны 600 п. і вікі з 3/4 дзес.—300 п. Пшаніца раней давала 30—35 п., а цяпер з той плошчы маем 87 п.

Вось што значыць шматпольле; на нас гледзячы і суседзі пачалі пераходзіць да шматпольля. У нашай вёсцы 56 двароў і з іх толькі 10 не перайшлі на шматпольле, а канюшыну сеюць усе гаспадары.

Усім беднякам і сераднякам, кажа т. Анішчанка, раю пераходзіць на шматпольле, сеяць травы, і тады яны палепшаць сваё становішча і дзяржаве змогуць больш даць прадуктаў сельскай гаспадаркі.

Пакажэце нам агранома.

Вельмі ўважліва слухалі сялянкі в. Рачча даклад аб пасеўкампаніі. Але за адну гадзіну сялянкі ня могуць вывучыць усяго таго, што неабходна ведаць кожнай гаспадыні для палепшаньня свае гаспадаркі.

Сялянка ў гаспадарцы вядзе гародніцтва, ёй-жа прыходзіцца жывёлу даглядаць, а ведаў аб усім гэтым нехапае.

За ўвесь час існаваньня Савецкай Улады агранома наша вёска ня бачыла. Мы просім, каб прыслалі да нас агранома. Няхай-бы ён растлумачыў нашым сялянкам, як вырасьціць лепшую гародніну, як даглядаць жывёлу і аб іншых галінах сельскай гаспадаркі.

Раччанскі.

Круглянскі раён.

Сялянкі насеньне перачышчаюць.

Па ўсім вёскам нашага сельсавету аграном рабіў даклад аб задачах веснавой сяўбы. Аграном тлумачыў чаму неабходна перачышчаць насеньне.

Асабліва ўважліва аднесьліся да перачысткі насеньня сялянкі—сябры сельсавету. Яны не чакалі, пакуль муж зьбярэцца павезьці насеньне, а самі жанкі вазілі насеньне для перачысткі, і намаўлялі суседак рабіць тое-ж.

Усе гуртом вязьлі сяляне перачышчаць насеньне. Гэта абяцае павышэньне ўраджайнасьці па нашаму сельсавету.

Хаміцкая П.

в. Скураты.

Агранамічныя веды сялянцы.

У вёсцы Дабасна, Бабруйскай акругі, былі праведзены сельскагаспадарчыя курсы для сялянак, па пытаньнях гародніцтва і садаводзтва. На занятках высьветлілася, што сялянкі больш за ўсё цікавяцца гародніцтвам і жывёлагадоўляю.

Стала наведвалі курсы на працягу 2-х тыдняў 42 жанчыны, з якіх 8 самастойных гаспадынь. Для большай назіральнасьці лекцыі курсаў ілюстраваліся туманнымі карцінамі. Слухачкі былі вельмі зацікаўлены курсамі.

У час зачыненьня курсаў слухачкі самі паставілі пытаньне аб тым, каб такія курсы арганізоўваліся штогодна. Слухачкі абяцалі апрацоўваць свае гароды так, як вучылі аграномы на курсах. Таксама ўлічылі неабходнасьць засеву буракоў, як харч для жывёлы.

Акрамя гэтага, пастаўлена было пытаньне аб арганізацыі малочнай арцелі і птушкаводнага таварыства. З гэтай мэтай РВК вясною выдаткуе грошы на 100 яек гатунковай птахі. У ўдоў і бяднячак будзе пасаджана 5 садкоў.

На курсах слухачкі атрымалі ня толькі веды па сельскай гаспадарцы, але ўзьнялі некалькі і свой культурны ўзровень.

Слухачкам раздалі сельскагаспадарчую літаратуру.

Аграном *Патудзін.*



Дзеці зьбіраюць попел.

Як трэба даглядаць і карміць падсосную матку.

Што неабходна зрабіць, каб сьвіньня добра гадавала парасят.

Вельмі часта, калі парасяты пачынаюць сасаць матку, яна нэрвуе, раптам кідаецца з месца і не падпушчае да сябе парасят. Гэта бывае галоўным чынам таму, што парасяты кусаюць і раняць саскі ў сьвіньні.

Пры гэтым бываюць выпадкі згубы і калецтва парасят. Каб папярэдзіць гэтае, перад тым як падпушчаюць парасят да маткі, трэба абгледзіць зубы ў іх; вострыя абламаць невялікімі абцугамі, а лепей пласкагубцамі. Апэрацыя гэта вельмі простая, толькі трэба выпаўняць яе акуратна, каб не параніць дзеснаў ў парасят і каб паверхня злому зуба была роўная.

Часта бывае, што парасят родзіцца больш, чым ёсьць саскоў у сьвіньні. Калі пажадана атрымаць больш крэпкіх і буйных парасят, дык лепей пакідаць пад маткай ня больш дзесяці.

Як трэба карміць падсосную сьвіньню.

Першыя 3—4 дні пасьля апаросу матку трэба карміць вельмі асьцярожна. Першы дзень ёй даюць баўтушку з невялікай колькасьцю мукі 1—1½ хунта.

На другі і трэцьці дадаюць мукі яшчэ больш 2—3 хунта, і калі вымя асабліва не перапаўняецца малаком, дык на 4-ты дзень пачынаюць карміць наступным чынам:

Асноўныя правілы кармленьня падсоснае сьвіньні: 1. Разнастойны корм. 2. Дабраякасныя кармавыя прадукты па норме. 3. Сваечасовая дача корму.

Лепшай лічыцца разнастойны корм.

Пажадана, каб палова кармовай дачы, не па вазе, а па агульнай каштоўнасьці, складалася з моцных зярнявых кармоў, а другая палова з сакавітых: бульбы, малочных адкідкаў і грубых—мякіны, канюшыны ці вікі з аўсом. Канюшыну і віку можна даваць у выглядзе травы (летам) альбо рэзкі з сена (узімку).

Як складаць кармавыя дачы.

Каб дакладна скласьці кармавую норму, трэба ведаць:

1. Жывую вагу сьвіньні. 2. Пажыўную каштоўнасьць разных кармоў.

Пажыўная каштоўнасьць гэта ёсьць колькасьць корму, якая па сіле роўна 1 хунту зярна, ячменю ці іншага збожжа.

Такім чынам, 4-я хунтамі бульбы можна замяніць 1 хунт зярна альбо 10 хунтаў сыровадкі ці 7 хунтаў кармавых буракоў.

Досьледамі ўстаноўлена, што для таго, каб парасяты добра расьлі, падсоснай сьвіньні трэба даць у дзень моцных кармоў:

а) На кожнае парася па аднаму хунту.

б) На самую сьвіньню 3 хунты.

Зараз складзем дачу кармавую з зялёнай часткі з заменай часткі моцных кармоў—грубымі, сакавітымі, па іх пажыўнай сіле, якую відаць з вышэй прыведзенай таблічкі:

Прыкладная кармавая дача для 6—8-пудовай сьвіньні з 7-ю парасятамі (узімку).

1. Аўсянай мукі	2	хунты, што роўна	2	хунтам зярна
2. Жытняй	2	„	2	„
3. Бульбы	16	„	4	„
4. Мякіны	¾	„	¼	„
5. Здыманага малака ці пахты	10	хунты.	¾	„
Разам			10	хунтаў зярна

Калі ў гаспадарцы няма мякіны дык яе магчыма замяніць канюшынай ці сенам (рэзка) Для замены ¾ хунта мякіны трэба ½ хунта канюшыны. 10 хунтаў зьнятога малака можна замяніць 17 хунт. сыроваткі. Аўсяную і жытнюю муку можна замяніць атрубамі.

Прыклады кармленьня (дача для лета) тэй самай сьвіньні.

Рознае мукі ці ватрубей	3½	хунты.	3½	х. зярна.
Гарохавай ці вікавай	1	„	1	„
Канюшыны—травы	20	„	2½	„
Здым. малака ці пахты.	18	„	3	„
Разам			10	хунтаў.

Тут таксама можна зрабіць замену кожнага корму тым, якога больш за ўсё ёсьць у гаспадарцы. Замест 16 хунтаў канюшыны—травы можна даць 20 хунтаў бацьвіньня і г. д.



Еврейка-крестьянка—член колхоза „Новая Жизнь".

Як трэба даглядаць за маткай.

Пераход ад аднаго корму да другога робіцца асьцярожна; асабліва гэта датычыцца сакавітых кармоў. Ні ў якім разе нельга даваць папсаваных і падапрэлых кармоў. Корм лепш даваць у выглядзе густой кашы. Ваду даваць паасобку, чыстай. Вельмі карысна ў корм дадаваць крыху солі і крэйды. Карыта трэба трымаць чыстым, вымываць яго і сушыць на сонцы. Карміць трэба абавязкова 3 разы ў дзень: 6-7 гадзін раніцай, 12 гадзін дню (поўдзень) і 6-7 гадзін увечары. У сьвінушніку павінна быць чыста. Нельга дапускаць, каб заставалася мача, бо парасяты п'юць і хварэюць ад гэтага паносам. У цёплае надвор'е матку з парасятамі выпускаюць на прагулку. Калі парасят аднімаюць ад маткі, сьвіньню пускаюць у злучку.

Аграном **Жыркевіч.**

Гутарка дэлегаткамі

Каму патрэбна варожасьць народаў.

Марфа з вялікім захапленьнем чытала абвестку па складам:—ка-му пат-рэб-на ва-ро-жасьць на-родаў.

— Бачыш, як чытаць ужо навучылася,—падштурхнула яе Ганна.

— А як-жа, амаль цэлую зіму ў лікпункт хаджу.

— Гэта як-жа зразумець—Варожасьць народаў,—зацікавілася Кацярына.

— А вось як,—адгукнуўся прышоўшы якраз кіраўнік, тав. Васільеў.

— У сучасным СССР, акрамя расійцаў, пражывае звыш 100 розных народаў. Пасьля Кастрычнікавае Рэволюцыі ўсе народы атрымалі магчымасьць разьвівацца самастойна, будаваць сваё культурнае і гаспадарчае жыцьцё. У нас зараз існуе Савецкая Беларусь, Украіна, Туркменская ССР і г. д. Усе сацыялістычныя рэспублікі дабраахвотна парашылі на зьезьдзе Саветаў у 1922 годзе стварыць Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

— Ну, і што нам ад гэтага,—запыталася Хвядосься.

— А вось што:—папершае, трэба памятаць, што быўшая царская ўлада прыгнячала ўсе малыя нацыянальнасьці былой царскай Расіі, як, напрыклад: беларусоў, украінцаў, палякаў, а яўрэяў—асабліва. Не давала ім магчымасьці разьвівацца. Яны ў культурных і гаспадарчых адносінах адсталі. Вось у братэрскім Саюзе Сацыялістычных Рэспублік нам аказваюць дапамогу рабочыя найбольш моцных рэспублік, асабліва РСФСР.

— Гэта, праўда,—вось у нас на фабрыцы запалак,—адгукнулася Маша, прыехаўшая на сьвята Лютаўскае Рэвалюцыі да сябе у вёску,—раней працавала каля 600 рабочых, зараз значна пашырылі фабрыку—працуе звыш 1500 рабочых, сярод якіх большасьць работніц. Грашовую дапамогу нам аказаў і Саўнарком СССР.

— А як-жа, і ў нас на панчошнай—машыны новенькія, колькасьць рабочых павялічычася разоў у 4—5. Панчохі выходзяць гарныя, каштуюць значна таней, чым раней,—пахвалілася Віця.

— Ну й таксама ў сялянскай гаспадарцы. Вось у нашай вёсцы,—кажа Настуля,—дапамаглі арганізаваць вельмі добры каляктыў, у які ўвайшла большая колькасьць беднякоў.

— Гэта я разумею. А вось у нас арганізавалі каляктыў,—выключна з яўрэяў, якія нічога агульнага з сялянскай гаспадарскай ня маюць,—быццам з абідай запыталася Алена.

— Вось у гэтым і ўвесь сэнс нашае палітыкі,—адказаў т. Васільеў.—Царская ўлада не давала правоў яўрэям пражываць у цэнтральнай Расіі, і яны павінны былі туліцца толькі ў тых межах, у якіх ім дазвалялі, напрыклад: у гарадох і мястэчках Беларусі, часткова на Украйне і Польшчы. Сельскай гаспадаркай ім не дазвалялі займацца, а ўрадавыя ўстановы служыць ня прымалі, на буйныя прадпрыемствы не дапускалі. Большасьць, такім чынам, прымушана была займацца саматужніцтвам, дробным гандлем і работай па найму ў тых гарадох, дзе ім дазвалялі жыць. Царская ўлада цкавала беларусоў супроць яўрэяў, расейцаў супроць беларусоў і палякаў і г. д.

Савецкая ўлада дала правы ўсім нацыянальнасьцям. Савецкая ўлада ў Беларусі за часы свайго існаваньня пабудавала шмат школ для абслугоўваньня дзяцей працоўных на ўсіх мовах. Беларускіх—4725 чатырохгодак, 216 сямёхгодак, таксама яўрэйскіх, польскіх і інш.

— Так, то так, праўда, у каляктыве яўрэі працуюць добра, ураджай іх ня кепскі, але-ж...—запнуўшыся на паўслове прагаварыла Марыля.

— Да што так,—накінулася на яе Віця.—Вось у нас на фабрыцы большасьць работніц яўрэек, жывем дружна. Быў у нас выпадак на адной з фабрык, калі работніца пачала цкаваць яўрэйку, і вось усе рабочыя паўсталі супроць яе, аддалі пад суд і зьнялі з працы.

— Варожасьць паміж працоўнымі зараз карысна толькі тым, якія жадаюць памяшаць сацыялістычнаму будаўніцтву. Вось вы чулі, можа, на Добрускай фабрыцы у Гомельшчыне быў выпадак, калі група рабочых цкавала яўрэяў. Але-ж потым высьвятлілася, што гэтыя рабочыя, не самдзелешнія рабочыя, а былыя жандары, манахіні, якім яшчэ сьніцца зварот царскае ўлады, даваўшай ім досыць смактаць пот і кроў працоўных.

Былі сярод антысэмітаў і кулакі, якія пралезьлі на фабрыку. Для нас яскрава адно, што нацыянальная розьнь была карысна раней царызму, а зараз ворагам пролетарыяту і працоўных сялян. Нашы ворагі—гэта багацеі, нэпманы і абшарнікі, незалежна ад таго, беларус ён, расіец, яўрэй, паляк і інш.

Мы, дэлегаткі, павінны самі ведаць і растлумачыць астальным працоўным жанчынам, што антысэмітызму і нацыянальнай розьні наогул не павінна быць мейсца сярод нас. Працоўныя будуюць сваю соцыялістычную гаспадарку пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, і мы павінны пад кіраўніцтвам партыі працаваць упарта і шчыра—усякі селянін і працоўны,—залпам прагаварыла Віця.

— Вось гэта праўда,—сказаў т. Васільеў,—мне здаецца, што Віця на ўсе запытаньні вам адказала і ўсё растлумачыла. Мы павінны парашыць, што трэба прыняць усе меры, каб зжыць астаткі нацыянальнай розьні і дасканала ўявіць сабе, што варожасьць народаў была карысна царскай уладзе, а зараз нэпманам, кулакам і абшарнікам—ворагам пролетарыяту. З гэтым мы павінны змагацца.

Б. Дварэцкая.

Беражыся здароўе

Бич человечества—сифилис.

(*Продолжение*).

Ровно через 2 дня Марья явилась в Венерологический Диспансер вместе со своей хозяйкой.

Врач сообщил хозяйке, что няня Марья больна сифилисом и на время болезни придется освободить ее от ухода за ребенком, т. к., ухаживая за ним, она может заразить его сифилисом. Доктор посоветовал хозяйке привести для осмотра ребенка, чтобы убедиться, не успел ли он уже заразиться. Сделав больной вливание лекарства или „сальварсана „606", врач приступил к продолжению беседы.

Напомнив вкратце о заражении половым и внеполовым путем, он указал больной, что первоначальная язвочка ея на срамной губе при правильном лечении может зажить в несколько дней. Распухание железок у нее в паховом канале указывает на то, что болезнь уже перешла в кровь, поэтому на заживление язвочки не следует смотреть, как на окончание всей болезни. Чрез 6—8 недель от заражения (иногда и больше) появляются новые признаки сифилиса, разные сыпи на теле, в виде пятен или прыщей, болячки во рту, в горле, на половых органах, около заднего прохода, между пальцами на ногах. Эти болячки мокнут и с них течет очень заразительный гной. Голос делается сиплым, начинают вылезать волосы на голове, по ночам появляются головные боли. В это время зараза находится и в слюне, в крови б-ого человека и он должен очень остерегаться, чтобы не заразить этой ужасною болезнью других.

Если больной, не теряя времени, обратится к доктору и начнет лечиться, то он может выздороветь совершенно. Но бывает также, что болезнь сразу не проходит, а скрывшись на некоторое время, через 2—3 месяца и больше появляется вновь, большею частью в виде разных сыпей на теле. Поэтому заболевший сифилисом должен долго следить, не проявится ли эта болезнь у него опять, и, заметив что-нибудь подозрительное, должен немедленно обратиться к доктору и принять меры, чтобы от него не заболели и другие. Если больной сифилисом будет старательно лечиться каждый раз, болезнь может оставить его совершенно и навсегда. Если же запустить болезнь не лечиться, когда она обозначается только сыпями на теле, то может болезнь резко ухудшиться и причинить в дальнейшем большие неприятности. Проявления болезни становятся все более тяжелыми. Болячки и прыщи, которые прежде иногда исчезали сами собой, теперь уже не пропадают, а превращаются в глубокие язвы. По телу в разных местах появляются красноватые чирья и шишки, которые прорываются, и на месте их образуются язвы. Начинается костоеда, кости пропухают, выходят целыми кусками. Появляется сильный вонючий насморк, начинает болеть нос, сначала продырявливается перегородка носа, затем из него выходят косточки и, наконец, нос проваливается, разрушает небо, и, вместо прежней чистой речи—человек гнусавит, а то и вовсе говорит только шепотом.

В это время больной уже испытывает и сильные боли в костях, особенно по ночам, не дающие больному покоя и лишающие сна. Сифилитическая зараза раз'едает также и другие органы, как печень, сердце, желудок, почки, кровеносные сосуды, головной и спинной мозг.

Сифилис страшен еще и тем, что он передается по наследству. Эта болезнь передается плоду уже в материнской утробе. В таких случаях беременность, по большей части, кончается выкидышем или рождением мертвого плода. Если ребенок и рождается живым, то он имеет хилый вид, кожа дрябла, покрыта сыпью. Такой ребенок страдает врожденным сифилисом.

— Но видите,—продолжал врач среди наших больных, которые сидят в ожидальной комнате, нет больных, которые были бы без носов, с большими язвами, как вы видели на картинках в ожидальне. Причина хорошего их состояния заключается в том, что эти люди, при самом начале заболевания, обратились к доктору за помощью, добросовестно выполняли все назначения врача и аккуратно посещали Диспансер. Вы встречали здесь и беременных женщин, многие из них не знали, что они больны сифилисом, рожали мертвых детей или выкидывали их раньше срока. При посещении консультации для беременных, они осматриваются там и нашим доктором из Диспансера, который направляет обнаруженных больных сифилисом и сюда для лечения. Такие матери принимают за время беременности несколько курсов лечения и рожают здоровых детей. В дальнейшем они приводят к нам детей для наблюдения за их здоровьем, а сами и после родов продолжают лечение, если в этом есть необходимость.

Во время беседы постучалась в кабинет больная со здоровым, веселым грудным ребенком на руках. Это была одна из многих б-ых, гражд. Екатерина М., 34 лет, которая, будучи 6 лет замужем, беременела, но детей здоровых не рожала, ей посоветовали обратиться в консультацию для беременных, откуда она попала в Венерологический Диспансер и, приняв 2 курса лечения, родила здорового ребенка.

— Для того, чтобы с вами не было тяжелых последствий сифилиса, вам придется в течение 6—7 недель аккуратно 2 раза в неделю приходить на уколы, которые, как вы уже убедились, не болят, один раз в неделю на вливание сальварсана „606", после этого отдохнете в течение 2—3 месяцев, а затем опять начнем курс лечения. Ваше лечение продлится, таким образом, 2—3 года, а затем будете находиться в течение 2-х лет под наблюдением. Вы должны себя держать чисто и опрятно, не должны употреблять спиртных напитков, т. к. доказано, что у пьющих

сифилис протекает тяжелее, чем у непьющих. Алкоголь—друг сифилиса. Не прекращайте сами лечения, когда заметите, что вам стало легче, а прекратите лечение, только по указанию врача. Ваша болезнь не запущена, лечение начали вы во время, можете надеяться, что вылечитесь, т. к. *сифилис—болезнь излечимая.*

Есть еще и теперь невежественные люди, которые надеются выздороветь, лечась у знахарей и знахарок. Они думают, что у знахарей можно быстрее вылечиться. Знахари обманывают темных людей, выманивают у них деньги.

В буржуазных государствах за лечение приходится платить, таким образом бедное население лечиться не может, у нас лечение и отпуск лекарств производится совершенно бесплатно, в городах—в Венерологических Диспансерах, а на районе в больницах или амбулаториях. В случаях, когда районному врачу не ясна болезнь, он отсылает б-ого в город. Надо помнить, что легче предохранить себя от заболевания, чем излечить ее. Для того, чтобы предохранить себя от сифилиса, необходимо знать то, что я уже говорил вам—пути передачи его. Никогда не следует пользоваться чужой ложкой, чашкой, вилкой, предварительно не вымыв их хорошенько в теплой воде. Не следует пить из общего ковша или кружки, давать игрушки одного ребенка—другому. Нельзя также пользоваться общими утиральниками, курить чужую трубку или папиросу, спать на чужой постели, целоваться с людьми, в которых ты не уверен, что они совершенно здоровы. Необходимо избегать половых сношений с такими женщинами и мужчинами, за которых нельзя ручаться, что они здоровы.

Мужчины большею частью заражаются от проституток, толкает их к проституткам половая распущенность и широко распространенный неправильный взгляд, будто сама природа так устроила мужчин, что половое воздержание для них вредно. Тот, кто так думает, жестоко ошибается. Воздержание в юности не только не вредно для здоровья, но даже сохраняет силы и способности.

— В заключение хочу сказать, что каждый сознательный гражданин и гражданка должны знать, что без помощи самого населения власть с этим большим злом—сифилисом не в состоянии справиться, поэтому все сознательные граждане должны помочь советской власти в борьбе с сифилисом. Белорусское Общество Кр. Креста—общественная организация, об'единяющая десятки тысяч рабочих и крестьян БССР—много помогает советской власти в борьбе с сифилисом. Красный Крест посылает свои подвижные венерологические диспансеры в наиболее пораженные сифилисом места БССР, производит обследование населения и лечение больных сифилисом.

А. Н. Шапиро.

Бл 829

Дзеці павінны тварыць.

(Дайце ім магчымасьць разьвіваць свае творчыя сілы).

Калі бываеш у сем'ях нашых дзяцей, то кідаецца ў вочы, што ўсё ў кватэры пабудована для дарослых і нічога для дзіцяці.

Уся мэбля, пасудак, кнігі, прыбраньне,—ва ўсім адбіваецца жыцьцё дарослых. Жыцьцё дзіцяці будуецца па дарасламу, і яно ня мае права ні да чаго дакрануцца: тое сапсуе, тое паламае, тым парэжацца, зробіць непарадак, намусьмеціць, разальле і г. д. Сталыя выкрыкі: „не чапай гэтага, нельга!" выводзіць дзіця з супакою, яно пачынае капрысіць—балавацца, як гавораць дарослыя, надакучае, яму няма чым заняцца, прыкласьці свае сілы, праявіць самастойнасьць; у яго няма сталага кутка ў хаце.

Дарослыя ў сваёй штодзённай працы і клопаце, як накарміць дзяцей, як адзець пры скупых сродках,—забываюць, што ў дзіцяці сваё жыцьцё, асабістае ад дарослых. Клопаты дарослых яму чужыя, яно расьце, разьвіваецца, яму трэба самадзейнасьць, рух, практыкаваньне ў сваіх сілах, у яго свае маленькія інтарэсы і патрабаваньні.

Калі гаворыш аб гэтым бацькам, то дарослыя звычайна апраўдваюцца цеснатой памяшканьня, недахопам сродкаў.

На самай справе гэта ня так, бо кожная сям'я штось купляе дзецям і траціць грошы не на тое, што трэба.

Што трэба даць дзіцяці?

Перш за ўсё яно павінна мець свой куток, сваё сталае месца, дзе можа распараджацца па-свойму. У гэтым кутку дзіцяці патрэбна крэсла, стол па яго росту, зроблены хаця з фанэрных скрынак. Зрабіць самую прымітыўную палічку, паставіць скрынку для абрэзкаў, матар'ялаў, цацак, складаючых з каробачак, катушак розных, пробак, вяровачак, стужачак, старых газэт, бумагі і апойкай, абрэзак дрэва, малаток, кніжкі, малюнкі. Усё гэта магчыма пабудаваць сваімі сіламі пры дапамозе таго-ж дзіцяці, не затраціўшы матар'яльных сродкаў.

Так абсталяваць куток можа кожная сям'я.

Што гэтым дасягаецца?—Дзіця менш прыстае да дарослых, яно занята, прывыкае да самастойнасьці. Дзеці находзяць у хаце тыя-ж матар'ялы, што ў яслях і садах.

Дайце дзіцяці той матар'ял, які ён можа скарыстоўваць па свойму, што дзіця робіць ня ўсякаму зразумела, але для яго каштоўна. Яно прыкладае тут сваю энергію і гэта зьяўляецца першым крокам да яго далейшага працоўнага жыцьця.

Выдавец—**Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б.** *Рэдактары* **С. Крэмер. Б. М. Меерзон.**

ПАРАДЫ ГАСПАДЫНЯМ.

Соус гарчышны прастой.

Адзін круты жаўток, палову чайнай лыжкі гарчыцы, солі, перцу па смаку, палову чайнай лыжкі цукру пакласьці ў чашку, прыбавіць трохі сьмятаны і расьцерці добра; прыбавіць астатнюю сьмятану (каля шклянкі) і падліваць патроху дзьве сталовых лыжкі воцату. Зьмяшаць, падаваць к халоднай рыбе і розным гатункам салату.

Суп з хлеба з гароднінай.

200 гр. чорствага хлеба парэзаць на кавалачкі альбо скарыстаць для гэтага застаўшыяся кавалкі, паджарыць трохі на масьле, а потым разварыць у вару, астудзіць і працерці з кавалкам масла (сьлівачнага альбо салёнага).

У той самы час у 12 шклянках вады зварыць нарэзаныя карэньні: палову морквы, палову сельдэрэю, трохі пятрушкі і капусты. Калі карэньні будуць гатовы, адвар працадзіць і зьліць з працёртым пюрэ з хлеба, добра разьмяшаўшы. Пакласьці адвараную гародніну, прагрэць добра, каб не закіпела, пасыпаць укропам і сечанай зеленьню, пятрушкі; падаваць з сьмятанай.

Ныркі.

Парэзаць нырку, абчысьціўшы яе ад тлушчу, зьняць плёнку, нарэзаць дробнымі кавалкамі, паджарыць у масьле, часта памешваючы, каб кавалкі зарумяніліся з усіх бакоў. Абсыпаць лыжкай мукі альбо дробна стоўчаных сухароў, уліць адну шклянку бульёну, дзьве лыжкі воцату, трошкі вады, перцу і солі. Даць скіпець толькі адзін раз, зараз-жа адставіць, каб больш ня кіпела, бо ныркі будуць цьвёрдыя.



Давай карове пойла, яна аддзякуе малаком.

Ад добрай квактухі—добрае курчанё.

Удалы вывадак можна атрымаць толькі з сьвежых яек, якія праляжалі ня болей двух тыдняў. Каб ведаць, колькі часу яйкам і ад якой курыцы трэба яйкі зьбіраць з гнёзд, кожны дзень і на кожным яйку трэба рабіць алоўкам значок.

Яйкі трэба хаваць у халодным месьце (у каморы ці сьвіронку), дзе ня было-б горача і каб марозам не прыхапіла.

Выбар яек пад квактуху.

Яйкі пад квактуху трэба выбіраць роўныя, каб сярод іх ня было занадта вялікіх і дробненькіх. Яйкі з вельмі тоўстай шкарлупою, а таксама з ледзьбачнай шчылінкай для наседжваньня не гадзяцца. Лепшымі яйкамі лічацца ад тых кур, якія нясуцца другую зіму. Калі яйкі ўзяты здалёку, напрыклад, з другой вёскі, дык іх трэба пакінуць ляжаць спакойна некаторы час, каб адстаяліся, а пасьля падкладаць іх пад квактуху.

Як садзіць квактуху.

Квактуху лепш за ўсе садзіць ўвечары. За ноч яна прывыкае да новага гнязда. Перад тым, як садзяць квактуху, трэба яе ачысьціць ад розных паразітаў; для гэтага курыцу абсыпаюць пярсідзкім парашком (прадаецца ва ўсіх аптэках), бо за доўгі час сядзеньня ў квактух расплоджваюцца паразіты, і яна не сядзіць спакойна на гнязьдзе.

Кладуць яйкі ў гняздо для наседжваньня адразу ўсе. Трэба прыняць за правіла—класьці пад квактуху столькі яек, сколькі яна можа зьмясьціць пад сябе—у сярэднім 11—15 яек.

Дагляд за квактухай і яйкамі.

Квактуху трэба паіць і карміць адзін раз у дзень; калі квактуха сама ня сходзіць з гнязда, дык яе трэба зьняць сілком. Карміць сухім зярном. Гняздо трэба аглядаць, вычышчаць курыны памёт. Калі яйкі забруджваюцца, трэба іх асьцярожна абмыць цёплаю вадою і мяняць падсьцілку. Кармленьне і прагулка квактухі не павінны працягвацца больш поўгадзіны. З 20-га дню ня сьлед квактуху зьнімаць для яды і наогул трывожыць.

Выхад куранят.

Калі квактуха ў першы раз выводзіць, каб яна не падушыла куранят, трэба падбіраць іх з-пад маткі, як толькі яны паабсыхаюць, і перакласьці ў кашэлік ці рэшата. Ніколі ня трэба дапамагаць кураняткам з яйца выбірацца, адкалупваючы скурку, бо гэтым можна пашкодзіць крывяныя жылкі.

Вэтэранарны ўрач *М. Жарын.*

Адказы на запытаньні.

1. Якая ільгота прадастаўляецца пры абкладаньні сель.-гас. падаткам тым гаспадарам, якія пашырылі пасеўную плошчу па параўнаньню з мінулым годам.

Адказ: Прырост пасеўнае плошчы аслабаняецца ад абкладаньня сель.-гас. падаткам у 1930-31 годзе.

3. Гр-ка А. зьвярнулася са скаргай на тое, што ў яе карысьць ня ўзысківаюцца алімэнты таму, што адказчык вылучыўся з гаспадаркі. Між тым, выдзел гэты фіктыўны.

Скарга была накірована ў Пракуратуру, па справе было вытварана расьледваньне і ўстаноўлена, што падзел фіктыўны. Пракуратура апратэставала вырак РЗК аб падзеле. Вырак адменен, гаспадарка прызнана адзінай і алімэнты ў сучасны момант спаганяюцца.

Менск, друкарня БДВ Заказ № 2042. У ліку 12 250 экз. Галоўлітбел № Г157.